*Незалежна ад модных уплываў, ад пераваг і густу кожны мужчына павінен ведаць класічныя правілы спалучэння гальштука з касцюмам і кашуляй:*

*Гальштукі з малюнкам можна апранаць толькі да аднатонных сарочак;*

*Аднатонныя гальштукі — да сарочак у клетку ці палоску (пры гэтым колер гальштука павінен супадаць з колерам палосак);*

*Да цёмнага касцюма і цёмнай сарочкі — больш светлы гальштук (лепш на тон святлейшы за касцюм);*

*Да цёмнага касцюма і светлай кашулі — цёмны гальштук у тон касцюма ці кашулі;*

*Да чорнага касцюма і белай кашулі — светлы гальштук з дробным малюнкам;*

*Да светлага касцюма і цёмнай кашулі — светлы гальштук у тон касцюма;*

*Завязаны гальштук павінен закрываць пражку і нават сантыметры на два спускацца крыху ніжэй за рэмень;*

*Шырыня гальштука павінна быць прапарцыянальная шырыні лацканаў і памеру пінжака.*

### Зімой і летам адным колерам?



Пры выбары адзення нямала ўвагі надаюць сезонным колерам: традыцыйна летам носяць больш светлае, яркае адзенне, зімой — наадварот. З гальштукамі ўсё інакш. У прынцыпе строгіх правілаў адносна зімовых і летніх колераў і ўзораў не існуе. Агульнае меркаванне, што зімой неабходна насіць цёмныя гальштукі, а летам — светлыя і яркія, няправільнае. Многія мадэльеры на зіму якраз прапануюць больш светлыя гальштукі, каб ажывіць цёмную зімовую гаму касцюмаў. А вось пры выбары матэрыялу ўлічваць сезон важна, бо не так і прыемна насіць шарсцяныя валокны летам. Гальштукі з шэрсці і больш тоўстыя, маюць «сухую», часам варсістую паверхню.

### Матэрыял, фактура

Акрамя натуральнага шоўку вельмі папулярны штучны шоўк. Ён нашмат таўсцейшы і грубейшы. У апошнія гады дызайнеры ўсё часцей і часцей прапануюць гальштукі з іншых натуральных матэрыялаў — шэрсці, кашміру, бавоўны і іх сумесі з шоўкам.

Сучасныя тэхналогіі ткацтва дазваляюць ствараць мудрагелістыя ўзоры на тканіне з дапамогай па-рознаму афарбаваных нітак ці выпуклы малюнак, так званы жакард. Менавіта такія гальштукі цяпер асабліва модныя. Яны вельмі падыходзяць да касцюмаў у натуральным экалагічным стылі. Іх колер як бы нейтральны, не кантрастуе з асноўным колерам касцюма, а прымітыўны ўзор, напрыклад, гарох, надае закончанасць знешняму выгляду.

### Памер мае значэнне

Самая актуальная шырыня гальштука сёння — ад 9 да 10,5 см. Залатое правіла — гальштук павінен быць прапарцыянальны лацканам пінжака: чым шырэйшыя лацканы, тым шырэйшы гальштук і наадварот. Але класіка застаецца класікай: да дзелавога класічнага касцюма не падыдзе занадта вузкі ці максімальна шырокі гальштук: ён павінен быць шырынёй прыкладна 6-7 сантыметраў, не больш. Калі вы аддаяце перавагу больш свабоднаму стылю — скураныя пінжакі, джынсы ці вузкія звышдоўгія штаны, яркія сарочкі, то вам падыдзе задзірліва стракаты і пры гэтым дастаткова кароткі гальштук шырынёй у тры-чатыры пальцы.



### Колер

Як і ў сарочках, гама расфарбовак гальштукаў багатая. Да таго ж на гальштуку могуць быць разнастайныя геаметрычныя малюнкі, кветкі, відарыс камп'ютараў, музычных інструментаў, піўных кубкаў, прадстаўнікоў жывёльнага свету — усё, што заўгодна.Такія гальштукі пажадана насіць пад аднатонныя класічныя кашулі. Калі вы не давяраеце сваймy чуццю, то выбірайце класічныя варыянты — не прагадаеце. Скажам, бяспройгрышныя спалучэнні — чорнае і белае, белае і сіняе, жоўтае і чырвонае, чырвонае і белае. Калі сумна, выходзьце на большы прастор. Напрыклад, да сіняга касцюма (пінжака) і белай кашулі падыдзе гальштук не толькі сіні, але і бардовы ў белы ці блакітны гарошак (гарошак у гэтым сезоне можа быць любых памераў). У такім стандартным класічным наборы вы будзеце выглядаць і прыгожа, і рэспектабельна.

А яшчэ пры выбары гальштука нядрэнна ўлічваць форму вашага твару. Калі вам уласцівыя акруглыя рысы, то падбірайце гальштук з мяккімі акруглымі дэталямі. Калі ж у твары прасочваюцца прамыя лініі, то лепш будзе выглядаць палоска ці клетка.

Калі пятнаццаць гадоў таму асноўная маса гальштукаў ткалася з паласатым малюнкам, толькі нешматлікія мадэлі мелі напячатаны ўзор. У 1985 годзе з'явіліся спробы змяніць традыцыйны малюнак, і да палосак дадалася дробная клетка. Затым у зеніт славы ўвайшоў шоўк, і праз нейкі час гальштук парваў з класіцызмам: на ім з'явіўся набіўны ўзор у выглядзе мініяцюрных малюнкаў. Сёння 85 працэнтаў усіх продажаў гальштукаў прыходзіцца на вырабы менавіта з набіўным малюнкам, нягледзячы на тое, што найбольш модным сёння з'яўляецца фактурны, сатканы ўзор.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

### ШУМЯЦЬ ЛЯСЫ

Штогод у Беларусі ствараецца больш як 40 тыс. га новых лясоў, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік міністра лясной гаспадаркі Мікалай Юшкевіч. За восем месяцаў гэтага года работы па лесааднаўленні праведзены на плошчы 39,7 тыс. га, у тым ліку на нізкабальных сельгасземлях — 8,2 тыс. га, на гарэльніках — 538 га, на землях, забруджаных радыенуклідамі — 7,9 тыс. га. Большую частку ляснога фонду складаюць хвойныя лясы (60 працэнтаў), у тым ліку сасняках — 50,4 працэнта, ельнікі — 9,6 працэнта. Мяккаліставыя пароды (бяроза, вольха, асіна) займаюць 35,4 працэнта ляснога фонду, а цвёрдаліставыя (дуб, ясень) — 4 працэнты.

**БЕЛТА.**

Краіна здароўя

Выпуск № 42 (98)

Азбука жыцця

# ДОБРЫЯ СПРАВЫ ПРЫЦЯГВАЮЦЬ УДАЧУ

**Гарадскі шум, ляжанне на канапе, расслабленне для хатніх гаспадынь, інфармацыйная лінія радавода, няшчасныя зайздроснікі, небяспека злых думак, надзея для цяжкахворых людзей, геніяльнасць нашых дзяцей, радасць ад кожнай хвіліны жыцця...**



Гэтым разнастайным тэмам прысвечана гутарка з горацкім біяэнергатэрапеўтам Валянцінам Таранавым.

***— Гукі сучасных гарадоў становяцца з цягам часу ўсё болей агрэсіўнымі. З аднаго боку — паток аўтатранспарту, з іншага — будоўля. Не ратуюць шклопакеты. Шум вуліц глушыць...***

— Гэта сур'ёзная праблема, яна турбуе ўвесь свет. Калі шум празмерны і працяглы, ён разбурае. І натуральна, што чалавек, які жыве ў вялікім горадзе на ажыўленым перакрыжаванні і пастаянна знаходзіцца пад уздзеяннем шумавых атак, будзе старэць хутчэй. Калі ёсць магчымасць, трэба выбіраць больш спакойнае месца для жыхарства.

***— Можа, як моладзь, браць плэеры і слухаць музыку ў навушніках?***

— Паслухаць такім чынам добрую музыку паўгадзіны ці гадзіну — бясшкодна для кожнага, а можа і карысна. Але калі плэер нагружае слухавую сістэму доўга і музыка празмерна гучная, то гэта ўжо шкодна. Лепей уключыць дома музыку на стацыянарным апараце, каб не было ўдарнай хвалі непасрэдна на вушы. Паслухаць, атрымаць задавальненне, падумаць пра сэнс жыцця...

***— У сучасным рытме чалавеку няма часу думаць пра сэнс жыцця.***

— Што ж, час мае сваю хуткасць. І, на жаль, са старэннем хуткасць гэта павялічваецца. Але трэба знаходзіць час на адпачынак і расслабленне. На жаль, асноўная маса людзей разумее адпачынак як ляжанне на канапе.

***— А гэта няправільна?***

— Абсалютна няправільна. Справа ў тым, што частка нашых унутраных органаў увогуле не створаныя для ляжання. Напрыклад, ідэальная сітуацыя для нырак — рэжым мяккага хістання, калі чалавек ідзе пешшу. З гэтай прычыны ў хворых, якія прыкаваныя да ложкаў, у першую чаргу ўзнікаюць праблемы з ныркамі.

А правільны адпачынак, нагадаю, гэта змена абстаноўкі. Звыклыя словы, на якія мы не звяртаем увагі. Трэба штодня хоць бы на гадзіну змяніць абстаноўку.

***— Абсалютна дарэмная парада для жанчын, якія не толькі працуюць, але яшчэ і маюць вялізны клопат у выглядзе хатняй гаспадаркі.***

— Я не згодны. Можна і каля пліты стаяць ды суп гатаваць, але пры гэтым спяваць песню. Цяпер ва ўсім свеце на ўздыме рэзанансная тэрапія. Яна заснавана на тым, што кожны орган і кожная клетка нашага арганізма хістаецца. І калі падтрымліваць амплітуду звонку, то гэта аказвае жыватворнае, лячэбнае ўздзеянне.

Справа гэта вельмі складаная, але мадэляваць патрэбны рэзананс можна і праз свае галасавыя звязкі. Нашы продкі ішлі на працу і з працы з песняй. Здаецца, ну як можа жанчына, якая з сярпом адпрацавала ўвесь дзень на спякоце, ісці і спяваць? Проста такім чынам продкі аднаўлялі сваю жыццёвую энергію.

***— Карацей, калі табе дрэнна — трэба заспяваць!***

— Абсалютна так. Суп будзе больш смачны, стомленасць пройдзе і жыццё будзе цудоўным.

Вось у мяне часта пытаюцца: ці добры адпачынак — заняткі ёгай? Толькі пры адной умове гэта дасць карысць: калі да позы лотаса вы дадасце правільнае дыханне і, што яшчэ важней, свядомасць. Калі вы будзеце стаяць на галаве і думаць, якая суседка зараза, то ад гэтага будзе толькі шкода. Ёга — гэта філасофія жыцця, уменне кіраваць сваёй свядомасцю і наладжваць яе на сузіранне і разуменне гэтага свету.

***— Здаецца, што не толькі гукі сталі агрэсіўнымі, але ўсё наша асяроддзе. Людзі злуюцца, канфліктуюць, сварацца. Можа, у нашым меркантыльным свеце ўсе забыліся, што добрыя справы прыцягваюць удачу, добрую энергію...***

— У даўніну і цяпер былі і ёсць заможныя людзі, якія аддаюць вялізныя сродкі на дабрачыннасць. А часам здараецца, што і лішніх грошай няма, але людзі ахвяруюць іх на добрыя справы. Што ж імі рухае?

Вось старыя, пенсіянеры — напэўна ж, не жыруюць — а яны стаяць у чарзе, каб аддаць свой «траяк» людзям, якія пакутуюць у бядзе. Навошта ім гэта трэба?

***— Я таксама была знаёма з людзьмі, якія палову свайго законнага адпачынку працавалі валанцёрамі ў хоспісе. А ў Магілёўскую вобласць у некаторыя інтэрнаты для дзяцей-сірот штогод прыязджаюць замежнікі, якія робяць рамонт.***

— Я мяркую, што падсвядомасць падказвае ім: добрыя справы рабіць абавязкова трэба, бо заўтра гэтая дабрыня абернецца карысцю шматразова. Калі не табе, дык дзецям і ўнукам, але абавязкова вернецца.

Таксама і зло вернецца. Таму што злыя ці негатыўныя думкі — самы разбуральны фактар для чалавека.

У кожным чалавеку ёсць родавая інфармацыя, якая, хочам мы гэтага альбо не, уплывае на яго. Яна рана ці позна нагадае пра сябе карай за грахі продкаў альбо нечаканым падарункам лёсу за духоўную чысціню ўжо даўно забытых сваякоў.

Інфармацыйная лінія радаводу — гэта нібыта мікрачып, які нам дадзены з нараджэння. Мы ім карыстаемся, ён назапашвае інфармацыю. І непазбежна злучацца мінулае і будучае ў адзіную лінію жыцця. Ад мінулага яшчэ нікому не ўдалося збегчы, і без мінулага няма будучага. Вось і адказ на ваша пытанне.

Што датычыцца грошай: людзі, абцяжараныя грашыма, маюць уладу, але часта не маюць шчасця. Звычайна кажуць, што добрага чалавека не могуць сапсаваць ні грошы, ні ўлада, таму што ў яго не бывае, як правіла, ні таго, ні іншага.

Але самыя няшчасныя людзі — гэта зайздроснікі. У іх на душы заўсёды кошкі скрабуць з-за ўсведамлення сваёй нікчэмнасці ў параўнанні з якім-небудзь іншым чалавекам.

***— З зайздрасцю, мне здаецца, можна справіцца і выкараніць яе. А калі з чалавекам здарылася сапраўды вялікая бяда, напаткала цяжкая невылечная хвароба. Як яму можна дапамагчы?***

— Немагчыма забыцца на вочы хворых людзей у анкалагічных стацыянарах. Там поўная безвыходнасць. Пачуццё страчанасці, вырачанасці, адзінота перад жыццём і лёсам. І ты думаеш толькі аб адным: наколькі цяжка чалавеку сам насам знаходзіцца з гэтай бядой. І побач можа не быць нікога, хто не толькі хацеў бы, але і мог дапамагчы. Бо такіх хворых трэба не толькі лячыць, ім трэба супакойваць псіхіку і грэць душу.

Людзі па-рознаму паводзяць сябе ў такой бядзе. Адны, як жывёлы ў прыродзе, сыходзяць паміраць у адзіноце. Я сустракаў такіх хворых на рак, якія прынцыпова адмаўляліся ад дапамогі медыкаў — былі ўпэўненыя, што іх захады не выратуюць, а, працягнуўшы трохі жыццё, толькі ўзмоцняць пакуты. Яны з'язджалі ў вёску, у радавую хату, жылі паўнавартасным жыццём і паміралі, як кажуць, на шляху...

Але кожны робіць выбар сам. Усё тут залежыць ад сілы волі, самавалодання, мужнасці. У многіх жыве надзея: а можа здарыцца цуд, які выратуе? І нельга пазбаўляць чалавека гэтай надзеі. Трэба быць побач і тлумачыць, што трэба мабілізаваць усе запасы жыццёвай энергіі і паспрабаваць адолець зло. Без імкнення чалавека да перамогі ніхто яму не дапаможа. Галоўнае — падтрымліваць надзею.

***— Давайце звернемся да дзіцячай тэмы. Пачаўся вучэбны год, маці хвалююцца за малых. Вучні, нават у малодшай школе, цяпер абцяжараныя шматлікімі кантрольнымі, тэстамі, экзаменамі. Што лепей зрабіць: скіраваць дзіця на барацьбу за лепшыя вынікі альбо пашкадаваць іх і задаволіцца тым, што ёсць?***

— Выбраць сярэдні варыянт. Нехта з філосафаў сказаў, што шчасце чалавека знаходзіцца паміж свабодай і дысцыплінай. Вось і трэба на гэтым адрэзку адшукаць тое, што пасуе. І далей крочыць па жыцці. Як сказаў Эпікур: «Плысці па жыцці, не напіраючы на яго».

Ведаеце, чамусьці прырода не любіць ідэальнага. Як правіла, усе геніі — няшчасныя людзі. А шэрых, няшчасных і ўбогіх заўсёды любілі і шкадавалі.

***— Кажуць, Богу і такія патрэбны.***

— Так. Што ж, можна падняць для дзіцяці планку на ўзровень выдатніка па ўсіх жыццёвых фактарах і накірунках. А калі мы яе завысілі? І насамрэч часцей за ўсё завышаем. Таму што мы, дарослыя, пестуем сваю святую мару, што наша дзіця — геніяльная асоба, дастойная толькі самага лепшага і высокага. Але гэта ілюзія — шкодная, небяспечная, разбуральная. І для нас, і для нашых дзяцей. Я мяркую, што лепей недабор, чым перабор у гэтай справе.

Яшчэ і з той прычыны, што няма сапраўднага тэсту, каб вылічыць вышыню планкі. І калі размаўляць пра асобу, то з якіх цаглінак складаецца эталон? Са здольнасці запомніць пэўны аб'ём інфармацыі і потым даць адказы камп'ютару? Гэта лухта. Таму што можна валодаць вялікім аб'ёмам інфармацыі і зусім не валодаць логікай. Тады гэта проста добрая запісная кніжка, і не болей.

***— Шчыра сказаць, у такім аспекце я пра праблему навучання дзяцей ніколі не меркавала. Здавалася бясспрэчным поспехам запомніць урок і напісаць кантрольную.***

— Я лічу, што, нават наадварот, некаторы дэфіцыт інфармацыі прымушае чалавека думаць лагічна. Ён можа ставіць нестандартныя пытанні і даваць нечаканыя адказы. Чаму сёння 60 працэнтаў адкрыццяў, вынаходніцтваў у свеце робяць людзі, якія ў гэтай канкрэтнай галіне не маюць вялікіх ведаў? Таму што яны не зашораныя, не зацыкленыя догмамі і стэрэатыпамі, не заціснутыя прызнанымі аўтарытэтамі.

Чалавек у вольным інфармацыйным палёце глядзіць наіўнымі вачыма і прапаноўвае простае рашэнне. Умоўна кажучы, выраўняць крывую трубу, на якую дагэтуль глядзелі дзесяць акадэмікаў і гэта думка проста не прыходзіла ў іх галовы.

Так і ў жыцці. Я мяркую, што самая галоўная мэта бацькоў — выгадаваць добрага чалавека, з правільным светаадчуваннем, з пастаянным імкненнем рабіць добрыя справы для людзей і любіць гэтых людзей. Гэта самая высокая прыступка: любіць усіх людзей.

***— Напэўна, для многіх недасягальная.***

— Так, адзін падабаецца, іншы — не. Гэты — сябар, а той — вораг. Вельмі цяжка нават не толькі любіць, але і аднолькава роўна ставіцца да ўсіх людзей. Але да гэтага трэба імкнуцца.

***— Валянцін Мікалаевіч, якія будуць вашы пажаданні чытачам «Звязды»?***

— **Першае:** трэба зразумець, што шчаслівым чалавекам можа быць толькі той, хто гэтага сапраўды хоча. Нашымі думкамі мы можам сябе адрадзіць, а можам і разбурыць.

**Другая думка:** багаты не той чалавек, які ўсё мае, а той, які ні ў чым не мае патрэбы. Калі Марка Твэна першым разам завялі ў вялікі ўніверсальны магазін і паказалі горы тавараў на многіх паверхах, то ён сказаў: «Госпадзі, я і не думаў, што можна пражыць цудоўнае жыццё і не ведаць, што ў свеце існуе такая колькасць непатрэбных рэчаў!» А часам імкненне да гэтых непатрэбных рэчаў ляжыць у аснове нашых ілюзій, і мы няправільна разумеем жыццё і яго мэты.

Галоўная мэта жыцця — гэта само жыццё. Стагні, галасі, злуйся, але іншага жыцця ўсё роўна не будзе. Гэта тваё жыццё і трэба цаніць кожны дзень і радавацца кожнай яго хвіліне.

**Гутарыла Ілона ІВАНОВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Небяспека

## Трэць насельніцтва планеты інфіцыраваны вірусам гепатыту В

**Агульная колькасць інфіцыраваных вірусам гепатыту В складае ў свеце 2 млрд чалавек, паведамляе прэс-служба Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ).**

У 350 млн чалавек назіраецца хранічная хвароба печані, выкліканая гэтым вірусам. Каля чвэрці дарослых людзей, інфіцыраваных у дзяцінстве, паміраюць ад раку або цырозу печані.

Эксперты СААЗ звяртаюць увагу на тое, што гепатыт В можна прадухіліць з дапамогай бяспечнай і эфектыўнай вакцыны, якая даступная з 1982 года. Каля 90 працэнтаў здаровых дарослых людзей, інфіцыраваных гепатытам В, выздараўліваюць і цалкам пазбаўляюцца ад вірусу на працягу паўгода. Толькі ў 8—10 працэнтаў дарослых гэта захворванне становіцца хранічным.

Гепатыт В з'яўляецца вірусная інфекцыяй, якая пашкоджвае печань і можа выклікаць цяжкую і хранічную хваробу і прывесці да смерці.

Вірус перадаецца пры кантакце з крывёю або іншымі вадкасцямі арганізма інфіцыраванага чалавека. Шляхі перадачы інфекцыі ідэнтычныя са шляхамі перадачы вірусу імунадэфіцыту чалавека (ВІЧ), аднак інфекцыйнасць гепатыту В у 50—100 разоў вышэйшая.

**Алена ЛІХАЧ, БЕЛТА.**

ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА!

# ШАНЦ НА ВЫРАТАВАННЕ

По адказ на пытанне: «Ці папулярная іпатэрапія ў нашай краіне і чаму?», я звярнулася да **Валянціны ВІНАГРАДАВАЙ, старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання верхавой язды і іпатэрапіі**.

— На жаль, гэты метад рэабілітацыі не выкарыстоўваецца ў Беларусі ў такой ступені, як, скажам, у Расіі ці Польшчы. У гэтых, а таксама іншых краінах свету, такі метад вяртання да нармальнага жыцця атрымаў прызнанне ўжо даўно. У нас жа з-за розных незразумелых для мяне прычын цяжкахворыя дзеці пазбаўленыя шанцу выратавацца з дапамогай іпатэрапіі.

Валянціна Аляксандраўна расказала, што за месяц у аб'яднанне звяртаецца больш за 20 чалавек, заняткі з якімі праводзяцца бясплатна. Часцей за ўсё гэта дзеці і падлеткі з такімі цяжкімі захворваннямі, як дзіцячы цэрэбральны параліч 1-3-й ступені цяжкасці, затрымка псіхаматорнага развіцця, анкалагічныя захворванні, вынікі траўмаў апорна-рухальнага апарата, аўтызм, эпілепсія. Хворыя з гэтымі дыягназамі трапляюць у аб'яднанне па накіраванні ўрача. Пасля праходжання курса рэабілітацыі запаўняюцца спецыяльныя анкеты, дзе сваё меркаванне наконт таго, палепшала дзіцяці ці не, выказваюць бацькі, урач, які даваў допуск, і інструктар, што займаўся з хворым. Як правіла, амаль заўсёды назіраюцца станоўчыя вынікі.

Шэсць гадоў таму пацвердзілі тое і ў навукова-даследчым інстытуце медыка-сацыяльнай экспертызы і рэабілітацыі. Спецыялісты гэтай установы правялі даследаванне такога метаду і прыйшлі да высновы, што іпатэрапію патрэбна рэкамендаваць да шырокага практычнага выкарыстання для рэабілітацыі інвалідаў неўралагічнага профілю, перш за ўсё — дзяцей і падлеткаў. Праўда, да гэтай рэкамендацыі ніхто не прыслухаўся.

А між тым Валянціне Вінаградавай ужо не раз даводзілася назіраць сапраўдныя цуды, што ствараюць коні, падымаючы дзяцей на ногі. Хворых, на якіх урачы ўжо махнулі рукой, яны вяртаюць да нармальнага жыцця. Дзякуючы такому выпадку, што адбыўся 10 гадоў таму, і з'явілася на свет аб'яднанне верхавой язды.

— У парку Горкага з просьбай «пакатаць» хворую пяцігадовую дачку да мяне звярнулася жанчына. Яна хацела выратаваць сваё дзіця іпатэрапіяй, бо да гэтага паспрабавала ўжо многае іншае. Спачатку я адмаўлялася, бо працавала толькі са здаровымі дзецьмі. Ды дзе ж гэта бачна: «катаць» дзіця-інваліда, не ведаючы нават, як да яго падысці. Але маці ад мяне не адыходзіла. У рэшце рэшт яна прынесла завераную натарыусам паперу, што да мяне ў выпадку чаго непрадбачанага прэтэнзій мець не будзе. Мы пачалі спрабаваць лячыць хворую канём.

Тады пра іпатэрапію я не мела яшчэ ніякага ўяўлення, эксперыментавала на сваю рызыку. Дзякуючы такім эксперыментам праз тры месяцы былая «жывая лялька» сядзела, а праз пяць — у яе запрацавалі ногі. Зараз дзяўчынка сама ходзіць, хоць урачы сцвярджалі, што хворая ніколі не зможа гэтага зрабіць. Вось пасля такога выпадку і з'явілася наша аб'яднанне, каб даць шанц яшчэ каму-небудзь быць здаровым.

Пасля першага цуду Валянціна Вінаградава, былы спартсмен-коннік, прайшла адпаведнае навучанне, наведвала семінары, практычныя канферэнцыі міжнароднага ўзроўню па іпатэрапіі, каб зразумець, якім чынам вараны ўздзейнічае на хворага. Але вучыць толькі сябе недастаткова: патрэбна яшчэ перадаць каню тое, што ты ад яго хочаш, каб заняткі з дзецьмі былі не толькі няшкодныя, але і карысныя.

— Неяк у інтэрнэце я натыкнулася на методыку трэніроўкі коней Пата Парэлі і была вельмі ўражана: без запужвання ці бізуна, толькі з дапамогай любові, дабрыні вы просіце каня зрабіць штосьці, а ён не проста робіць тое, а робіць з задавальненнем. На мой погляд, гэта адзіная правільная методыка падрыхтоўкі коней пад іпатэрапію, бо яна не столькі вучыць жывёлу разумець чалавека, колькі дазваляе гаспадару разумець свайго гадаванца. У выніку — вараны зусім па-іншаму рэагуе на каманды, поўнасцю разнявольваецца і можа ўспрымаць інваліда.

Здаецца, у чым праблема: коні да заняткаў па іпатэрапіі падрыхтаваныя, такі метад рэабілітацыі прыносіць станоўчыя вынікі. Жыві ды радуйся. Бяда толькі ў тым, што іпатэрапія ў нашай краіне афіцыйна не зарэгістравана. Хоць афіцыйна існуе аб'яднанне верхавой язды, у статуце якой запісана, што асноўная мэта стварэння арганізацыі — развіццё іпатэрапіі ў Беларусі. Атрымліваецца, што, з аднаго боку, іпатэрапія ў Беларусі існуе, а з другога — нібы і не.

Такая ж незразумелая сітуацыя і з методыкай, па якой займаюцца іпатэрапіяй. Яна нібы і ёсць (распрацавана 10 гадоў таму В. Вінаградавай і Г. Шанько (на той час ён — галоўны дзіцячы неўрапатолаг Беларусі), але яна не зарэгістравана.

— На сёння ў Маскве распрацавана методыка работы з дзіцячым цэрэбральным паралічам, — кажа Валянціна Аляксандраўна. — Яна значна больш пашыраная і паглыбленая, чым тая, што ў свой час стварылі мы. Маскоўскую методыку можна ўзяць за аснову, дапрацаваць і ліцэнзаваць. Але каб гэта зрабіць, патрэбна мець нармальнае памяшканне для заняткаў іпатэрапіяй, а мы такім не валодаем. Як бачым, усё ўпіраецца ў тое, што патрэбна ўласная база.

Вось з-за адсутнасці ўласнай базы і пакутуе Валянціна Аляксандраўна, а разам з ёй і яе гадаванцы: коні вымушаны жыць у гаражы, бо іншага жылля ў іх няма. Не вытрымала такіх умоў і памерла кабыла Дуся, з-за гэтага пачалі хварэць іншыя коні аб'яднання.

— Не ведаю, як я вытрымліваю: дзесяць гадоў спрабую дастукацца да гарадскіх чыноўнікаў, — уздыхае старшыня грамадскага аб'яднання. — Складваецца такое ўражанне, што іпатэрапія нікому не патрэбная, акрамя бацькоў, што хапаюцца за яе як за адзіную выратавальную нітачку, ды іх хворых дзетак. Мае сілы ўжо на зыходзе. Але, калі я ў чарговы раз пазіраю ў вочы тых дзетачак, што прыходзяць да мяне на заняткі, разумею, што зноў і зноў буду «дзяўбціся» ў каменную «чыноўніцкую» сцяну.

Дзіўна неяк атрымліваецца: створана спецыяльнае аб'яднанне, што можа дапамагчы інваліду рэабілітавацца (ужо не адзін такі выпадак адбыўся); распрацавана адпаведная методыка, але яна не зарэгістравана; ёсць спецыялісты, але яны не маюць магчымасці нармальна працаваць і дапамагаць дзецям; па спецыяльнай методыцы падрыхтаваны коні, але яны жывуць у «нечалавечых» умовах. Чаму б не далучыць аб'яднанне Валянціны Вінаградавай да той жа Ратамкі? Там цудоўныя ўмовы для вараных, тут «спецыяльныя» коні; там ёсць дзе займацца з хворымі дзецьмі, тут адукаваны спецыяліст для гэтых заняткаў? Няўжо з-за незгаворлівасці аднаго чыноўніка з другім павінны пакутаваць дзеці-інваліды, для многіх з якіх гэты рэабілітацыйны метад, можа, адзіны шанц на нармальнае жыццё?

**Марына ЛЯВОШКА.**

Азбука бяспекі

# ПРАБЛЕМА КУЛЕКСАЎ — ПРАБЛЕМА ВЯЛІКІХ ГАРАДОЎ

**Перыядычна жыхары гарадскіх кватэр пакутуюць ад нашэсця надзвычай надакучлівых істот — дробных камароў. Гэтыя насякомыя не толькі раздражняюць сваім начным піскам, балюча кусаюцца і прымушаюць бясконца чухацца, — яны яшчэ могуць быць прычынай алергічных рэакцый у людзей, схільных да гэтага. Сёлетні летні перыяд для «камарыных атак» не выключэнне.**

— Гэтыя камары адносяцца да так званага роду кулекс. Яшчэ іх называюць гарадскімі, бо месцам свайго жыхарства яны выбіраюць вялікія гарады, — расказвае **энтамолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана ЯШКОВА**.

Кулексы вельмі надакучлівыя насякомыя рудога адцення. І хоць яны не малярыйныя, усё ж з'яўляюцца разносчыкамі шэрагу іншых інфекцыйных паразітарных захворванняў — такіх, як сібірская язва, бруцэлёз, філерытоз, ліхаманка КУ. Кожны год энтамолагі рэспублікі даследуюць гарадскіх камароў на абравірусныя інфекцыі. За апошнія гады з камароў роду кулекс былі выдзеленыя вірусы Сінбіс і Заходняга Ніла. Гэта адбылося ў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Мінскай абласцях.

Крывасмокі могуць пладзіцца ў проціпажарных бочках, дробных лужынах, канавах, ямах. З надыходам халадоў большасць з іх гіне, але частка прабіраецца ў памяшканні, туды, дзе цёпла і ёсць вільгаць. Пераважна гэта падвалы дамоў з няспраўнай каналізацыяй, высокім узроўнем грунтовых вод, нейкімі падтапленнямі. У такіх умовах камары могуць пладзіцца круглы год.

Развіццё лічынак адбываецца пры тэмпературы 14—15° і вышэйшай, аптымальна —18—23°. Пры тэмпературы 18° развіццё ад яйка да дарослай асобіны працягваецца 27 дзён, пры тэмпературы 27° — 15 дзён. Адна лічынка можа адкладваць 150—300 яек.

З падвалаў па вентыляцыйных шахтах камары трапляюць у кватэры. Яны дабіраюцца нават да восьмага—дзявятага паверхаў.

Летам насякомыя могуць разлятацца і ў іншыя дамы, знаходзячы сабе новыя месцы выпладу — не толькі падвалы, але і вадаёмы, якія знаходзяцца на адлегласці 1,5—2 кіламетры, і там зноў адбываецца іх развіццё.

Праблема кулексаў з'яўляецца ў асноўным праблемай вялікіх гарадоў. Два разы ў год спецыялісты-энтамолагі даследуюць на тэрыторыі, якую яны абслугоўваюць, усе дамы, выяўляюць пабудовы з падтапленнямі і выпладам і ставяць іх на ўлік. Як аказалася, амаль у кожным другім доме, дзе ёсць падтапленні, адбываецца развіццё лічынак кулексаў. Гэта даволі высокі працэнт.

Дамы, дзе выяўлены выплад, ставяць на ўлік на працягу года. І здымаюцца з уліку толькі тады, калі там праведзена дэзынфекцыя, няма вады і камароў. Можа быць праведзена і паўторная апрацоўка.

У рэспубліцы ёсць пабудовы, у тым ліку і ў Мінску, у якіх на працягу некалькіх гадоў плодзяцца крывасмокі. Але, вядома, гэта залежыць не толькі ад работы энтамолагаў. Вельмі важна, дзе і як пабудаваны дом. Спецыялісты эпідслужбаў удзельнічаюць у санітарным наглядзе пры будаўніцтве жылля. Пры будаўніцтве дома і выбары зямельнага ўчастка абавязкова кантралюецца, наколькі глыбока залягаюць грунтовыя воды. Найбольш спрыяльнай для забудовы лічыцца тэрыторыя, дзе яны знаходзяцца на тры і больш метраў ад паверхні.

Што могуць процістаўляць самі гараджане «атакам» кулексаў? Варта закрываць сеткай фортки, нацягнуць дробнаячэістую сетку на вентыляцыйныя шахты, асабліва калі ідзе выплад. Летам можна прымяняць розныя рэпеленты, адпужвальныя рэчывы. Выбар антыкамарыных сродкаў вялікі. Але прынцыпова яны дзеляцца на два віды — фуміганты, якія забіваюць, і рэпеленты, якія адпужваюць насякомых. Першыя больш зручна выкарыстоўваць у памяшканнях, калі камары перашкаджаюць спаць. Другія — у лесе, на свежым паветры. З рэпелентаў лепш карыстацца крэмамі і мазямі — яны, у адрозненне ад спрэяў, не шкодзяць дыхальным шляхам.

— Аднак гэта ўсё ж не радыкальныя меры, — гаворыць Святлана Яшкова, — перш за ўсё неабходна праводзіць работу ў падвальных памяшканнях. А патрабаванні тут такія: падвалы павінны быць асветленыя, у іх не павінна быць смецця, нечыстот. Варта адпампаваць ваду, высушыць памяшканне, правесці дэзынфекцыю. Падвал заўсёды трэба трымаць зачыненым. Акрамя таго, уваходныя дзверы павінны шчыльна прылягаць да касякоў, вентыляцыйныя адсекі абараніць здымнымі рашоткамі, а вокны зашкліць. І яшчэ варта ліквідаваць бліжэйшыя дажджавыя лужыны, ямы з вадой — іх трэба засыпаць ці зрабіць сток. Бо там, дзе вада, — там і камары.

**Вольга ШАЎКО.**

**Народная медыцына рэкамендуе наступныя раслінныя сродкі супраць насякомых**

- Карані пырніку тройчы ўскіпяціць у 1,5 л вады. Гэтым адварам праціраць скуру.
- На падаконні можна разлажыць вату, намочаную ў алеі гваздзікі, эўкаліпту, анісу. Калі няма алергіі, алей можна нанесці на скуру.
- Вазоны з клешчавінай варта паставіць у кожным пакоі.
- Некалькі разоў на месяц праціраце вокны і дзверы лаўровым алеем.
- Зусім не даспадобы камарам пах бузіны чорнай і зялёнага таматнага бацвіння.

## Прыярытэты — помнікі нашай культурнай спадчыны

**Дамову аб генеральным супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і ЗП «Брыціш-Амерыкан Табака Трэйдзінг Компані» ўчора падпісалі кіраўнікі гэтых арганізацый.**

Чатыры гады таму фонды бібліятэкі былі папоўнены 39 рарытэтнымі выданнямі XVII—XVIII стст., у 2006 годзе быў выдадзены альбом «Рарытэты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», падрыхтаваны тыраж электроннай версіі «Слуцкага Евангелля». Мяркуецца, што падпісанне дамовы аб генеральным партнёрстве дазволіць выйсці на новы ўзровень супрацоўніцтва, больш глыбокі і сістэмны.

— Нацыянальная бібліятэка — гэта арганізацыя, якая захоўвае самыя каштоўныя дасягненні, што ёсць у беларускім пісьменстве, — адзначыў Раман Матульскі, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. — На сёння галоўнае намаганне — віртуальнае аднаўленне калекцый, саміх дакументаў, цэлых бібліятэк, факсімільныя выданні найбольш значных помнікаў. Фактычна гэта і ёсць прыярытэты нашага супрацоўніцтва з «Брыціш-Амерыкан Табака».

У сваю чаргу дырэктар ЗП «Брыціш-Амерыкан Табака Трэйдзінг Компані» Эдуард Грамовіч падкрэсліў важнасць супрацоўніцтва з бібліятэкай:

— У нас маюцца дастаткова моцныя традыцыі супрацоўніцтва: колькі гадоў мы працуем на гэтым рынку, столькі і ўдзельнічаем у сацыяльных праектах Беларусі. І Нацыянальная бібліятэка — наш асноўны партнёр. Мы ганарымся гэтым.

Дарэчы, цяпер вядзецца сумесная праца дзвюх арганізацый над тым, каб выдаць не толькі электронную версію «Слуцкага евангелля», але і факсімільную. Патрымаць новае выданне праваслаўнай святыні можна будзе ўжо недзе на пачатку наступнага года.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Русалачка паплыве ў Шанхай

Адна са знакамітых мясцін Даніі — вядомая статуя андэрсанаўскай Русалачкі, якая з 1913 года ўпрыгожвае Капенгаген, — прыбудзе ў Кітай на час правядзення Сусветнай выставы ў Шанхаі, перадаюць інфармагенцтвы. Рашэнне аб «падарожжы» Русалачкі было прынята дацкім урадам пасля таго, як сталі вядомыя імёны пераможцаў конкурсу праекта дацкага павільёна на ЭКСПА-2010.

Знакамітую статую змесцяць у басейн з пяццюстамі тысячамі літраў марской вады, спецыяльна прывезенай з Капенгагена. На набярэжнай жа дацкай сталіцы ўрад установіць вялікі экран, на якім у прамым эфіры будзе трансліявацца падарожжа казачнай гераіні. Ганс Хрысціян Андэрсан напісаў казку аб дачцэ марскога цара, закаханай у прынца, у 1837 годзе. Карл Якабсэн, заснавальнік вядомай на ўвесь свет піваварні і шчодры мецэнат, убачыў балет паводле матываў і загарэўся ідэяй падарыць гораду скульптуру самаадданай гераіні. Ён заказаў фігуру скульптару Эдварду Эрыксану, і ўжо ў 1913 годзе гараджане ўбачылі Русалачку вышынёй 1 м 25 см на беразе, якая сядзела на дальмене з кускоў граніту.

**Кар. БЕЛТА.**




# ПАДЗЯЛІЦЬ РАХУНАК

*Жыву ў дзяржаўнай двухпакаёвай кватэры разам з мамай, якая з'яўляецца асноўным кватэранаймальнікам, і дачкой сямігадовага ўзросту, якую нарадзіла па-за шлюбам. Хачу падзяліць асабовы рахунак, але апасаюся, што ў выпадку смерці маці яе частка кватэры адыдзе дзяржаве.*

**Галіна Д., г. Мінск**

У выпадку падзелу асабовага рахунка з вамі і вашай маці будуць заключаны асобныя дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду на тыя памяшканні, якія будуць выдзелены кожнай з вас у выніку падзелу.

Каму прадастаўляецца жылы пакой у кватэры дзяржаўнага жыллёвага фонду, заселенай некалькімі наймальнікамі, у выпадку смерці аднаго з іх, падрабязна адказвае Палажэнне, зацверджанае Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2005 г. № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносінаў».

Згодна з пунктам 55 гэтага Палажэння, калі ў кватэры, заселенай некалькімі наймальнікамі ў адпаведнасці з дагаворам найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, вызваліўся жылы пакой, не ізаляваны ад пакоя другога наймальніка, то свабодны жылы пакой прадастаўляецца ў яго валоданне і карыстанне.

Калі вызваліўся ізаляваны жылы пакой у кватэры, дзе пражываюць наймальнікі ў адпаведнасці з дагаворам найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду (далей — наймальнікі) або ўласнікі жылых памяшканняў прыватнага жыллёвага фонду (далей — уласнікі) і наймальнікі, то свабодны жылы пакой прадастаўляецца па пісьмовай заяве аднаму з іх у адпаведнасці з дагаворам найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў парадку чарговасці зыходзячы з часу прыняцця на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Калі ў кватэры адсутнічаюць наймальнікі і ўласнікі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, свабодны ізаляваны жылы пакой прадастаўляецца наймальніку, які пражывае ў кватэры і не стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на яго пісьмовай заяве.

Калі ў кватэры няма маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў наймальнікаў і ўласнікаў, а таксама няма наймальнікаў, якія не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, свабодны ізаляваны жылы пакой прадастаўляецца ў адпаведнасці з дагаворам куплі-продажу ўласніку, які пражывае ў кватэры, і не мае патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, па яго пісьмовай заяве.

## 59 ноўтбукаў для... асабістага карыстання

**Сумеснымі дзеяннямі супрацоўнікаў Гродзенскай рэгіянальнай мытні і УКДБ па Гродзенскай вобласці выяўлены канал незаконнага перамяшчэння праз мытную мяжу ноўтбукаў і камп'ютарных камплектуючых.**

Паводле інфармацыі прэс-групы Гродзенскай рэгіянальнай мытні, камерцыйная партыя тавару (59 ноўтбукаў, 1 прынтар і 25 флэш-картаў агульным коштам 108 мільёнаў 855 тысяч рублёў) была ўвезена з Польшчы фізічнымі асобамі без мытных плацяжоў пад выглядам маёмасці, прызначанай для асабістага карыстання. Затым людзі, якія ажыццяўлялі ўвоз тавару, перадавалі яго сапраўднаму ўладальніку, атрымліваючы за гэту паслугу ўзнагароджанне.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# «ЧЫТАЦЬ «ЗВЯЗДУ» не толькі цікава, але і выгадна»

**На мінулым тыдні «Звязда» ўручыла чарговы тэлевізар па выніках розыгрышу сярод падпісчыкаў на трэці квартал і другое паўгоддзе 2008 года. Шчаслівай уладальніцай каляровага «Віцязя» стала жыхарка пасёлка Коханава Талачынскага раёна Надзея Мікалаеўна Красоўская.**




*Антаніна ЛАПАТКО ўручае «Звяздоўскі» тэлевізар Надзеі КРАСОЎСКАЙ (злева).*

Па дарозе ў Коханава мы заехалі ў Талачын да начальніка раённага вузла сувязі Антаніны Лапатко. Яна шчыра парадавалася ўдачы зямлячкі і адклаўшы свае надзённыя справы, якіх у падпісную кампанію асабліва шмат, паехала з намі выконваць прыемную місію дастаўкі прыза. Не абмінула сваёй увагай гэту падзею і мясцовая прэса. Журналіст «Нашай Талачыншчыны» Сяргей Абрамовіч не толькі ўзяў інтэрв'ю ў нашай чытачкі і зрабіў фотаздымкі «цырымоніі ўручэння», але і вельмі дапамог нам з упрыгожаннем памяшкання пошты шарыкамі, за што яму асобная падзяка.

Надзея Красоўская, наша прызёрка, — былая настаўніца пачатковых класаў. Расказала, што «Звязду» выпісвае з часоў «перабудовы», але знаёмая з ёю была з дзяцінства, бо газету выпісвалі бацькі:

— Чаму выпісваю дагэтуль? У «Звяздзе» адлюстраваны ўсе мае інтарэсы. Тут я прачытаю і пра палітыку, і пра эканоміку, і навіны міжнародныя, і проста актуальныя жыццёвыя пытанні, калі паліва даражэе, ці камунальныя паслугі... Вельмі люблю вашы рубрыкі «Алё, народ на провадзе», «Простая мова», гараскопы заўсёды чытаю, надвор'е...

Латарэйныя купоны дасылаю не так ужо часта, але, як бачыце, трапна. Тэлевізар — гэта не першы прыз, што я выйграла ў «звяздоўскай» латарэі. Некалькі гадоў таму пашанцавала на бейсболку, яе да вас у рэдакцыю прыязджаў забіраць сын, ён у Мінску працуе. Так што цяпер кажу мужу, а ён у мяне чалавек практычны, што чытаць і выпісваць «Звязду» не толькі цікава, але і выгадна.

Як прыхільніца рубрыкі «Алё, народ на провадзе» і проста чалавек з пачуццём гумару, Надзея Мікалаеўна расказала нам на развітанне смешную гісторыю са свайго працоўнага жыцця. Мы вырашылі не чакаць, пакуль яна дашле яе на рэдакцыйную пошту ў нашу гумарыстычную рубрыку і ўзняць настрой тым, хто пакуль яшчэ не выйграў у нашай латарэі. Галоўнае, памятайце, што Фартуна, яна ж жанчына такая... сёння да вас адным бокам, заўтра — другім... А «Звязда», калі выпішаце, будзе прыходзіць кожны дзень, нягледзячы на настрой Фартуны. Так што, чытайце, усміхайцеся, наступны раз, спадзяёмся, вам абавязкова пашанцуе!

### АД КАГО ДЗЕЦІ Ў БАБЫ-ЯГІ?..

*Вучні трэцяга класа атрымалі творчае заданне скласці сваю казку, самастойна. І вось на ўроку дзеці дэманстравалі свае магчымасці, расказвалі казкі.*

*Адна вучаніца пачынае: «Жыла-была Баба-яга... І было ў яе тры сыны».*

*Клас маўчыць, уважліва слухае, і толькі хлопчык Саша, кемлівы, жвавы, уголас абураецца: «Як, у Бабы-ягі тры сыны?! Яна ж ніколі замужам не была!»*

*У класе дружны выбух смеху... Сумеўся Саша: з каго смяюцца? Разгублена кажа: «Можа ад Змея-Гарыныча? У яго ж тры галавы...»*

**Таццяна ЛЯЎКОВІЧ.**

Асабістае

# БАРАЦЬБА ВАКОЛ МУЗЫКІ

## Калі суседка пасля начной змены адпачывае, піяніна дачкі можна выкінуць на сметнік?

**У новую кватэру прыгожай дзевяціпавярхоўкі на другім паверсе па вуліцы П. Панчанкі Мінска мая сям'я пераехала прыкладна год таму. Недзе да сакавіка ў нашым першым пад'ездзе было спакойна... Не, ціха не было: навасельцы ўвесь час нешта свідравалі, рэзалі і грукалі мэбляй, а ў перапынках «давалі джазу» яшчэ зусім малыя дзеці. Часам здавалася, што наш панэльны дом гудзе, як пабуджаны барабан.**

Наша сям'я таксама дапамагала гусці дому, бо ў другой дэкадзе сакавіка пасля дзвюх дачок у мяне нарадзіўся сын, але самым дрэнным гукам для маіх новых суседзяў з першага паверха стаў «голас» нашага піяніна. На піяніна грае мая 11-гадовая дачка, якая займаецца ў музычнай школе, таму мелодыі на музычным інструменце ў яе ўжо атрымліваюцца, аднак... Маладая інтэлігентная і, упэўнены, высокаадукаваная пара з суседняй кватэры з першай агучанай ноты запісала піяніна ў разрад галоўных ворагаў свайго спакою. Як толькі дачка пачынала іграць, то адразу знізу грукалі па батарэях, уключалі дрыль, гнеўна сігналізавалі па дамафоне...

* * *

Неўзабаве мы сустрэліся з суседам на нейтральнай тэрыторыі і амаль адшукалі рашэнне, што задавальняла абодвух. Я быў таксама згодны з тым, што з 15.00 да 20.00 у працоўныя дні мая дачка на працягу 30—40 хвілін будзе займацца музыкай. Аднак бліжэй да лета нашай маленькай піяністцы неабходна было адточваць больш складаную музычную праграму на працягу гадзіны ў дзень і ў выхадныя. А вось процілеглы бок з рашэннем залічыць і выхадныя ў спіс часткова музычных дзён быў катэгарычна супраць. Летам дачка адпачывала ў бабулі, таму сапраўды дарослая барацьба супраць музычных гукаў пачалася менавіта ў верасні.

На гучанне нашага піяніна зноў загрукалі суседскія батарэі і заспявала дрыль. Батарэйная музыка бязлітасна прымушала прачынацца і плакаць усіх немаўлят першага пад'езда. Тады я спецыяльна абышоў усіх сваіх суседзяў, у якіх растуць малыя дзеткі, і даведаўся, што 30 хвілін у дзень грання на піяніна нашых пузаноў бадай ніяк не непакоіць. Ігра маёй дачкі на піяніна замінае толькі адпачынку двум дарослым гаспадарам кватэры на першым паверсе. Так здарылася, што нашы кватэры непасрэдна суседнічаюць толькі па лініі невялікага пакойчыка, дзе і стаіць тое самае піяніна.

Дачка мая і цяпер іграе на піяніна пад груканне па батарэях, аднак барацьба вакол гукаў днямі перайшла ў стадыю сур'ёзнага міжкватэрнага процістаяння. Пры сустрэчы з суседам я паспрабаваў даведацца аб удакладненні новых сапраўды рэальных тэрмінаў музычнай падрыхтоўкі маёй дачкі з выкарыстаннем і выхадных. Аднак малады чалавек быў непахісны ў сваіх поглядах наконт выхадных, а піяніна ўвогуле параіў выкінуць на сметнік. Калі ж мы будзем і далей упарта пілікаць, тады нас чакаюць маштабныя непрыемнасці, удакладніў сваё разуменне сусед.

* * *

Недзе два тыдні таму, калі нас з жонкай не было дома, на хатні тэлефон пазваніў участковы і паразмаўляў з маёй дачкой. Прадстаўнік праваахоўных органаў пацікавіўся, ці іграе яна на піяніна, ці ведае, што перашкаджае адпачынку суседзяў, а таксама аб тым, што бацькі не дамовіліся з суседзямі па існуючай праблеме. У гэты ж дзень я перазваніў участковаму і даведаўся, што заява з боку суседзяў наконт гучнай ігры на піяніна была. Участковы запэўніў, што сустракацца мне з ім для ўдакладнення сітуацыі няма сэнсу, бо адпаведную паперу па заяве ён ужо накіраваў у камісію па справах няпоўнагадовых (!?). (Цікава, за якія такія сур'ёзныя парушэнні дачка трапіла на аловак міліцыі? — **Аўт.**). А ўвогуле, што гэта не яго, а ЖЭСа справа — займацца шумам у кватэрах. Суразмоўца паведаміў, што па выніках разбору я буду загадзя праінфармаваны па тэлефоне. Я супакоіўся, але дарэмна. Бо...

* * *

Пазаўчора, прыкладна пасля абеду, у нашу кватэру, да маёй жонкі, якая даглядае паўгадавалага сына і пяцігадовую дачку, наконт «справы піяніна» завіталі ажно два прадстаўнікі мясцовай улады — супрацоўніца ЖЭСа і наш знаёмы ўчастковы. Работніца ЖЭСа выслухала жонку, даведалася, што «запіліканая музычным інструментам» сям'я суседзяў не мае дзетак, і пашкадавала ўжо нашу сям'ю, але нічога дакладна не параіла і не растлумачыла. Крыху пазней гісторыю пра «беднае піяніна» мая другая палавіна паведаміла і ўчастковаму. Работнік апорнага пункта склаў на нашу сям'ю нейкі пратакол, дзе па сутнасці справы запісаў толькі тое, што мая дачка і сапраўды час ад часу іграе на піяніна. На слушныя пытанні маёй жонкі ўчастковы паведаміў, што суседка-заяўніца працуе часам і ў начную змену, а мы ігрой на піяніна замінаем ёй дзнём **адпачываць,** што з'яўляецца парушэннем правілаў карыстання жылымі памяшканнямі.

* * *

Я спецыяльна пацікавіўся ў рэдакцыйнага юрыста, аб чым гаворыцца ў правілах карыстання жылымі памяшканнямі. У раздзеле II пункта 6.11 у прыватнасці гаворыцца, што «карыстанне тэлевізарамі, радыёпрыёмнікамі, магнітафонамі і іншымі гучнымі ўстройствамі дапускаецца толькі пры ўмовах памяншэння гучнасці да ступені, якая не парушае спакою жыхароў жылога дома. З 23 да 7 гадзін павінна захоўвацца цішыня».

Наколькі я правільна зразумеў дакумент, то ў ім нічога не гаворыцца пра музычныя інструменты. Узнікае і другое пытанне: якім чынам мне можна паменшыць гук піяніна і да якой ступені, каб не было праблем з суседзямі? Узнікае тут і рытарычнае пытанне: ці сапраўды выкарыстоўваецца ў нашых праваахоўных органах практыка «прасавання» членаў адной сям'і, каб абараніць інтарэсы тых, хто піша скаргі?

Лічу свой артыкул адкрытым лістом да зацікаўленых арганізацый і чакаю канкрэтных адказаў. Разумею, што ў справе пра «беднае піяніна» кропка яшчэ не пастаўлена...

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НЕРАЗГАДАНАЯ ТАЯМНІЦА ЖАНЧЫНЫ

## Фестываль «Белая вежа» прыемна здзіўляе гледача

Трынаццаты тэатральны брэсцкі фэст адкрываў на гэты раз свой мясцовы тэатр. І не штонебудзь паказалі гаспадары фестывалю, а «Злачынства і кара». Шчыра кажучы, я баялася ісці на гэты спектакль. Не сталічны нават тэатр, а замахнуўся на гэткую глыбу — Фёдара Міхайлавіча. Было страшна, каб не выглядала пастаноўка жаласліва, каб не зганілі яе прыезджыя госці. Але страхі рассеяліся ў першай палове першай дзеі. Дастаеўскі ў версіі рэжысёра Цімафея Ільеўскага прымушаў думаць. І гэта галоўнае. Успомнілася дыскусія вакол здымак Уладзімірам Бартко фільма «Майстар і Маргарыта». Некаторыя з мэтраў кінематаграфіі тады абвінавачвалі рэжысёра нават у тым, што ён адважыўся экранізаваць адзін з самых загадкавых твораў Булгакава. А на мой погляд, дык помнік трэба ставіць за такую адвагу. Класіка — гэта ж не старажытныя лацінскія трактаты, да якіх можна далучыцца толькі ў цішы бібліятэк. Класіку трэба чытаць, ставіць, спрачацца аб ёй. У класіцы ёсць вечнае, якое заўсёды сучаснае. Да таго ж ставіць класіку неймаверна цяжка, заўсёды ёсць рызыка паўтарыцца, паказацца банальным. А брэсцкі рэжысёр не спалохаўся. І спектакль адбыўся. На традыцыйным абмеркаванні крытыкі, тэатразнаўцы звярнулі ўвагу на недахопы і набыткі спектакля. А рэжысёру Цімафею Ільеўскаму сказалі бадай што самае прыемнае ў гэтай сітуацыі: ад яго чакаюць новых рэжысёрскіх знаходак.

Адным з галоўных адкрыццяў першай паловы фестывальнай праграмы стаў, несумненна, спектакль «Цэнтра драматургіі і рэжысуры» з Масквы «Паўдзённы раздзел». Летась калектыў паказаў на нашым фэсце «Нінкіну зямлю», якая нарабіла многа шуму. А сёлета артысты прывезлі складанейшы інтэлектуальны спектакль па п'есе французскага містыка і сімваліста Поля Кладэля. Высокая любоўная драма на чатыры асобы амаль не мае сюжэту: чацвёра людзей плывуць на параходзе. Чацвёра — гэта жанчына і трое мужчын, якія яе кахаюць. Кажуць, што ў аснову твора пакладзена сапраўдная гісторыя Поля Кладэля, маладога тады дыпламата, які захапіўся Разаліяй Рыльскай падчас сваёй службы ў Кітаі. У спектаклі таксама ёсць малады прыгожы высокаадукаваны герой Мяза, які з галавой рынуўся ў каханне да чароўнай і грэшнай Ізэ. Другі яе каханак — прыгажун Дэ Сіз, гэткі сучасны супергерой, і муж бізнэсмен, які горача любіць дзяцей. А яна разрываецца паміж імі, і пры гэтым жыве, пакутуе, радуецца, добра ўсведамляючы, якую сілу мае яе прыгажосць. Трохгадзінная дзея-псіхааналіз не выклікае суму, наадварот, яна трымае гледача ў пастаянным напружанні. Хто гэтая жанчына: дзіця распусты, грэшніца ці выратавальніца, гатовая прынесці сябе ў ахвяру? Прыгажуню Ізэ іграе французская актрыса рускага паходжання Таццяна Сцяпанчанка. І яе своеасаблівы акцэнт нечакана дадае шарму гераіні. Яе кахаюць усе, а каго кахае яна, Ізэ і сама не ведае, але яна застаецца з тым, хто па злой волі другога ахвяраваны на смерць... Адчуванні ў час прагляду напомнілі аўтару гэтых радкоў адчуванні больш чым дзесяцігадовай даўніны, калі да нас прыязджаў віцебскі коласаўскі тэатр з п'есай лаўрэата Нобелеўскай прэміі Іосіфа Башэвіса-Зінгера «Тайбэлэ і яе дэман». Недзе ўнутры ўзнікала адно і тое ж пытанне: хто аўтарам п'ес і пастановак — мужчынам — выдаў самае патаемнае і запаветнае ў сутнасці жанчыны, як праніклі яны ў святая святых жаночай псіхалогіі?

Аказваецца, свой «Паўдзённы раздзел» Уладзімір Агееў паказваў у Францыі, на радзіме Кладэля, і там спектакль прайшоў з поспехам. Брэсцкі глядач таксама ацаніў пранікнёную ігру маскоўскіх артыстаў, ім апладзіравалі стоячы.

Лёгкі прыемны спектакль прывёз Дзяржаўны акадэмічны тэатр драмы з Бураціі. «Улейскія дзяўчаты» — дзея відовішчная, фальклорная і адначасова сучасная. У аснове сюжэта — вяселле з ракавой дзяўчынай-духам, якая гатовая звесці жаніха. Зноў загадка, і драма жанчыны, і адначасовае адрыццё напаўзабытых вечных ісцін. Свет пачуццяў жанчыны даследаваў нават вулічны тэатр з Польшчы. Наогул вулічныя спектаклі былі сёлета надзвычай удалыя, яны заваёўваюць усё болей сэрцаў публікі. Фаварыт леташняй «Белай вежы» Львоўскі тэатр «Уваскрэсенне» літаральна пакарыў вячэрняга гледача сваёй трактоўкай таго, як людзі чытаюць газеты. Аказалася, па тым, як і якой перыёдыцы аддае перавагу чалавек, можна вызначыць і яго ўнутраную існасць. «Дзіўны свет, або Як людзі чытаюць газеты» ўразіў дасціпным гумарам, відовішчамі, спецэфектамі, незвычайнай пластыкай. Вулічныя пастаноўкі прыемныя яшчэ і тым, што на іх можна хадзіць без білетаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

**КОНКУРС РАШЭННЯЎ**

**Заданне № 11**



Мат за 5 хадоў (8+9).

**Заданне № 12**



Мат за 5 хадоў (10+8).

**ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ**

Праверце свае рашэнні заданняў конкурсу, змешчаных 23 жніўня і 4 верасня г.г.

**Заданне № 5. 1.** Kh1! — цугцванг. 1. ... Кр.h1 (h2) 2. Крf2, 1. ... Крf1 2. Лg7!

**Заданне № 6. 1.** Cg8! — цугцванг. 1. ... Крd6 2. Лd8+ 1. ... e6 2. Крc7!

**Заданне № 7.** Цудоўны ўступны ход: 1. 1. Фh1! З пагрозай па «брызтолю» 2. Лa1! Кр:c2 3. Фb1!x, 1. ... c3 2. Фd5! Кр:c2 3. d3x, 1. ... Кр:c2 2. Фf3! Крb2 3. d4x, і 1. ... b6 2. Лb1+ Кр:c2 3. Фe4x — вяртанне белага ферзя.

**Заданне № 8. 1.** Крd6! Кр:b4 2. Крd5 Крa5 3. Крc5, 1. ... Крd4 2. Ca5 Крc4 3. Крe5.

Адказы даслалі Юрый Бандарэнка (Магілёў), Віктар Быкаў, Сяргей Гурыновіч, Мікалай Янучок (усе — Мінск), Мікалай Балянкоў (Рагачоўскі раён), Алег Бадзюкоў (Круглянскі раён), Іван Козел (Мазырскі раён), Валерый Лук'янчык (Талачынскі раён), Аляксандр Марцуль (Шчучынскі раён), Анатоль Прынеслік (Віцебск), Алег Чарневіч (Барань), Іван Цітовіч (Паставскі раён).

**ЗАПРАШАЕМ ДА ЎДЗЕЛУ**

Рэдакцыя газеты «Olimpiya dunyasi» (Азербайджан) абвясціла конкурс па складанню эцюдаў. Тэма свабодная. Папярэднія вынікі конкурсу будуць апублікаваныя ў лютым 2009 года. Усім, хто атрымае адзнакі, будуць высланы вынікі конкурсу.

Творы дасылайце на e-mail I. Аліева ilhamaliev@mail.ru.

* * *

Цэнтр спорту і адпачынку ў S-e rock (Польшча) аб'явіў конкурс складання шахматных задач у наступных раздзелах: трохходовыя задачы, задачы на зваротны мат, задачы на кааператыўны мат у 2,5 хода. Тэма свабодная. Пераможцы атрымаюць медалі ў кожным раздзеле. Суддзя — Woldemar Tura. Задачы на дыяграмах і з поўным рашэннем дасылайце да 15 кастрычніка 2008 г. Адрас: Osradek Sportu I Rekreacji w Serocku, Pultuska 4705 — 140 Serock (szachy), Poland — Польшча, або на e-mail: serock 2005@poczta.fm.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**«21» октября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5**

**ПРОВОДИТ АУКЦИОН**

с применением метода понижения начальной цены по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков, составляющих единые предметы аукциона

**На аукционные торги выставляются:**

| Сведения о капитальных строениях и их местонахождении | Основные характеристики капитальных строений | Общая площадь, кв. м | Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания капитальных строений, га | Срок аренды земельного участка, лет | Начальная цена предмета аукциона (имущества/права заключения договора аренды земельного участка), руб. | Минимальная цена предмета аукциона (имущества/права заключения договора аренды земельного участка), руб. | Сумма задатка единого предмета аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ №1:** Капитальное строение (клуб) (инв. № 640/С-21364), расположено по ул. Социалистической, 133, в г. Слуцке Минской области | Здание двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, полы дощатые. Имеются: водопровод, канализация, электроосвещение, теплоснабжение, горячее водоснабжение, вентиляция, введено в эксплуатацию в 1933 году. | 888,3 | 0,2389 | 51 | 174 019 347 (153 198 867/ 20 820 480) | 143 380 480 (122 560 000/ 20 820 480) | 15 000 000 |
| **ЛОТ № 2:** Капитальное строение (учебный корпус) (инв. № 640/С-21366), расположено по ул. Социалистической, 133 в г. Слуцке Минской области | Здание двухэтажное, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, крыша совмещенная, полы дощатые, плиточные, ДСП. Имеются: водопровод, канализация, электроосвещение, теплоснабжение и вентиляция, введено в эксплуатацию в 1933 году. | 1131,8 | 0,4457 | 51 | 286 932 911 (248 082 041/ 38 850 870) | 237 316 870 (198 466 000/ 38 850 870) | 20 000 000 |

Согласно решению Слуцкого райисполкома от 24 ноября 2005 г. № 1410 предоставлены РУП «1993-я центральная инженерная ремонтная база» земельные участки для содержания и обслуживания зданий.

Введено ограничение в использовании земельного участка площадью 0,2389 га сформированного для обслуживания клуба, в связи с его расположением в охранной зоне канализационного коллектора.

Порядок и сроки осмотра объектов республиканской собственности оговариваются с продавцом имущества.

**Продавец имущества**: республиканское унитарное предприятие «1993-я центральная инженерная ремонтная база»,

Адрес: г. Слуцк Минской области, ул. Социалистическая, 133, тел. (801795) 48242.

**Арендодатель земельного участка:** Слуцкий районный исполнительный комитет.

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Слуцким райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 13 февраля 2007 г. № 77 и Указом Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник. Аукционист называет новую цену объекта республиканской собственности и номер этого участника трижды и объявляет его победителем.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09.**

Последний день подачи заявок 20 октября 2008 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.

## КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД

Склаў Валянцін НАЛІМАЎ.



**Перакладзіце на беларускую мову словы і запоўніце клетачкі малюнка. Па гарызанталях:** 3. Согласие. 8. Клеёнка. 9. Нравоучение, назидание. 10. Итог, результат. 13. Леший. 15. Направление. 17. Русак (заяц). 18. Басня. 19. Омут, водоворот. 20. Грусть, уныние. 21. Бугор, остров (песчаный). 24. Плен. 26. Батрак. 28. Исток. 29. Повар. 32. Лента (в косах). 33. Предок. 34. Милка, любушка. **Па вертыкалях:** 1. Свора, стая. 2. Привидение. 4. Касторка. 5. Зачёт. 6. Близкий родственник. 7. Округа. 11. Рюмка. 12. Движение. 13. Лакомство. 14. Резон, разумное основание. 16. Падеж (грам.). 22. Горячая зола. 23. Роща. 25. Любитель. 26. Полнолуние. 27. Уголок. 30. Тесак. 31. Зной, жара.

А на мой погляд...

# ТЭЛЕГЛЯДАЧ ВЫБІРАЕ НАВІНЫ І «ПАЗНАВАЛЬНАГА» КАЛДУНА

**На тэлебачанні стартаваў новы сезон: усе як адзін каналы прапаноўваюць гледачам свае праекты, прычым, як правіла, практычна ў адзін час. Калі глядзець запар усе гэтыя шоу, серыялы, дык каля «блакітнага экрана» давядзецца ці не штовечар «адпрацоўваць» другую змену.**

А ў вас увогуле ёсць час глядзець тэлевізар? Якім перадачам вы аддаяце перавагу, што вас найперш цікавіць?

**Святлана ПАЛЯШЧУК, старшыня праўлення Капыльскага раённага спажывецкага таварыства:**

— На жаль, у мяне ўвогуле няма часу глядзець тэлевізар. Калі выпадае вольная хвілінка, аддаю перавагу цікавым праграмам. Серыялы я, як кажуць, ва ўпор не бачу. А вось навіны гляджу ў абавязковым парадку. Магу звярнуць увагу на пазнавальную перадачу. Калі гаварыць пра беларускае тэлебачанне, адзначу перадачу, якую вядзе Георгій Калдун.

**Яўгенія КУРЛОВІЧ, вядучы спецыяліст аддзела пенсій і дапамог упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Берастаўіцкага райвыканкама:**

— Калі шчыра, дык глядзець тэлебачанне асабліва не атрымліваецца — няма часу. Хіба толькі зімой больш магчымасцяў. Увогуле я лічу, што больш карысна пачытаць газету, кнігу. А калі ўжо глядзець нешта, дык карыснае. Увечары абавязкова ўключаю навіны, у тым ліку і па айчынных каналах, з цікавасцю гляджу абласное тэлебачанне — дзе што робіцца ў рэгіёне, у суседзяў. Падабаецца, напрыклад, як мне здаецца, карысная беларуская перадача «Ход у адказ» — там задаюць цікавыя пытанні, падбіраюць экспертаў. Раней не звяртала ўвагі на Георгія Калдуна, потым неяк паглядзела яго перадачу — спадабалася. Можа, калі на пенсію выйду (*смяецца*), будзе больш вольнага часу на прагляд іншых тэлепраграм.

**Сяргей САРОКІН, начальнік галоўнага ўпраўлення выторчай і сацыяльна-эканамічнай работы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

— Без тэлебачання цяпер жыццё ўявіць немагчыма: там столькі рознай інфармацыі. Таму з ім я, можна сказаць, сябрую. Але аддаю перавагу тым перадачам, якія могуць быць мне карыснымі ў працы, проста задавальняць чалавечую цікаўнасць: навінам, тым, што расказваюць пра эканоміку — айчынную і сусветную, асвятляюць міжнародную дзейнасць. Калі гаварыць пра беларускае тэлебачанне, апошнім часам аддаю перавагу Першаму каналу. Ён неяк, на мой погляд, імкліва палепшыўся, ажывіўся, сцісла, але разнастайна інфармуе гледачоў і пра жыццё краіны, і пра сусветныя навіны не забывае. Гляджу навіны і па іншых каналах, напрыклад, «Нашы навіны» на АНТ, падабаюцца выніковыя за тыдзень «Контуры».

**Барыс КРАСЬКО, пенсіянер, вёска Ігрушка Крупскага раёна:**

— Я ж пенсіянер, не працую, але, скажу вам, уплывае і пара года: з вясны па восень толькі ўвечары нешта глядзець выпадае, хіба толькі зімой — удзень. Серыялаў не выношу, хоць цяпер з жонкай гляджу «Агонь кахання». Яшчэ «Вяртанне Мухтара» можна было глядзець — там сабака прыгожы (*смяецца*). Як гісторыка-географа па адукацыі мяне найперш цікавяць перадачы пра жывёл, пра далёкія землі-краіны, падабаюцца гістарычныя і дакументальна-гістарычныя фільмы. Паважаю і з задавальненнем каторы раз пераглядаю ранейшыя савецкія стужкі, вось паглядзеў праграму — будуць паказваць пра Шэрлака Холмса. Хоць і бачыў не раз, але зноў уключу тэлевізар.

**Святлана САРВІРАВА, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Гомельскага дзяржаўнага аграэканамічнага каледжа:**

— На тэлевізар у мяне час ёсць. Аддаю перавагу навінам і пазнавальным перадачам. З апошніх адзначу найперш шоу Георгія Калдуна, вось што сапраўды, лічу, карысна, пазнавальна. У нас у каледжы існуе нават падабенства такой гульні — працуе гуртoк, які наведваюць навучэнцы. Я ўхваляю іх цікаўнасць.

«Мыльныя оперы», якія расцягваюцца на 100—200 серый, не гляджу. Ну, яшчэ з дзясятак серый (*смяецца*), калі фільм якасны, вытрымаць магу. А ўвогуле, калі, напрыклад, мастацкая стужка будзе добрай, дык яе адной дастаткова на вечар. Навіны ж гляджу і беларускія і расійскія, аддаючы перавагу апошнім.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.48 | 19.18 | 12.30 |
| Віцебск | 6.37 | 19.08 | 12.31 |
| Магілёў | 6.38 | 19.08 | 12.30 |
| Гомель | 6.36 | 19.04 | 12.28 |
| Гродна | 7.04 | 19.33 | 12.29 |
| Брэст | 7.05 | 19.33 | 12.28 |

**Месяц**

*Апошняя квадра.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

*Пр. Елізаветы, Раісы, Аўдзея, Апанаса, Глеба, Давыда, Захара, Максіма, Фёдара.*
*К. Ірмы, Ірэны, Мацея, Станіслава, Юзафа.*

## НАДВОР'Е на заўтра




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +9..+11°С | КІЕЎ +9..+11°С | РЫГА +10..+12°С |
| ВІЛЬНЮС +10..+12°С | МАСКВА +13..+15°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +11..+13°С |

## Дзве даты — 18 верасня



**1918 год** — нарадзіўся Віктар Талаліхін, савецкі лётчык-знішчальнік, Герой Савецкага Саюза. Адным з першых выканаў таран варожага самалёта ў начным баі, збіўшы яго на подступах да Масквы.

**1830 год** — заснавана Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Карскага. Менавіта гэта бібліятэка стала першай публічнай бібліятэкай у Беларусі. Аснову бібліятэкі складалі ахвяраванні жыхароў горада, ніякіх грашовых сродкаў ад дзяржавы не паступала. У 1859 годзе гродзенскі губернатар нават прапанаваў усім служачым горада ахвяраваць 1 працэнт сваёй зарплаты на ўтрыманне бібліятэкі.

## Цытата дня:

*«Веды, не народжаныя вопытам, мерай усякай дакладнасці, бясплодныя і поўныя памылак».*

**Леанарда да Вінчы.**

# Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81*

№ 27 (277)

## Яшчэ не ўвесь сабраны ўраджай



Плады **абляпіхі** варта здымаць пасля першых замаразкаў, страсаючы іх з галінак на разасланую пад дрэвам плёнку. Да замаразкаў (ці пасля іх) можна здымаць плады з галінак паасобку, хоць гэты спосаб найбольш працаёмкі і ўдаецца лепш, калі плады добра здымаюцца з пладаножкай.

Плады **ароніі** (рабіны чарнаплоднай) збіраюць увосень у адзін і той жа тэрмін. Калі яны прызначаны для перапрацоўкі, тады збіраюць без шчыткоў, а калі для захоўвання — трэба збіраць са шчыткамі, пазбягаючы пашкоджання кальчака. Плады ароніі могуць захоўвацца да двух месяцаў пры тэмпературы не вышэй чым 10 градусаў у скрынках ёмістасцю да 8—10 кг. У замарожаным выглядзе ва ўпакоўцы да 0,5 кг могуць захоўвацца на працягу 6 месяцаў. Замарожванне не толькі падаўжае тэрмін захоўвання свежых пладоў, але і паляпшае іх смакавыя ўласцівасці (зніжаецца іх даўкасць, павялічваецца цукрыстасць).



Пасля збору **маліны** неабходна выразаць паражоныя галінкі, якія адпладаносілі, вынесці іх з участка і спаліць. У прысядзібных садах неабходна прышчыпнуць верхавінкі новых парасткаў на вышыні 80—100 см, што садзейнічае іх адраўненню і павышае ўстойлівасць да палягання, выклікае рост 2—4 бакавых парасткаў, павышае прадукцыйнасць раслін.

Кусты **агрэсту** і парэчкі пасля збору ўраджаю неабходна апрацаваць 10-працэнтнай бардоскай вадкасцю ці іншымі пестыцыдамі для барацьбы з антракнозам, мучністай расой, кляшчамі і іншымі шкоднікамі.



**Яблыкі** збіраюць па тэрмінах выспявання. Спачатку здымаюць плады ў ніжняй частцы кроны, затым з галін, размешчаных у сярэдняй і верхняй частках кроны дрэва. Калі пад дрэвам многа ападу, яго неабходна прыбраць загадзя. Здымаючы яблык, не націскайце на яго пальцамі, не цягніце ўніз, а паварочвайце, адрываючы разам з пладаножкай. Для лепшага захоўвання плады можна пераламжыць драўнянай стружкай, паперай, мохам і іншымі матэрыяламі. Вельмі важна, каб упаковачны матэрыял не меў пабочнага паху, не быў таксічны і не ўбіраў вільгаць. Тэмпература захоўвання павінна быць бліжэй да 0 градусаў, а вільготнасць паветра каля 85—90 працэнтаў. Лепш за ўсё плады захоўваюць свае смакавыя ўласцівасці, калі яны раскладзены па стэлажах.



**Яблыкі і грушы зімовых гатункаў** добра захоўваюцца ў поліэтыленавай плёнцы. Для гэтага ў скрынку кладуцца два палотнішчы плёнкі крыж-накрыж. Плады ўкладваюцца радамі, а краі плёнкі затым закрываюцца канвертам.

Можна плады ўкладваць па 1,5—2 кг у поліэтыленавыя мяшочкі (пакеты), якія шчыльна завязваюць моцнымі ніткамі ці шпагатам і складваюць на стэлажы ў адзін слой. Пакеты пры гэтым не павінны дакранацца адзін да аднаго.

Перад загрузкай на працяглае захоўванне плады неабходна ахаладзіць. Таму пажадана пакінуць іх на ноч, напрыклад, пад павецю, а раніцай загрузіць у склеп ці іншае месца для захоўвання.

## Не паўтарайце памылак

Ад якасці раслін-саджанцаў залежаць вашы далейшыя матэрыяльныя затраты, настрой, а адсюль — і здароўе. Расліны, якія вырошчваюцца ў гаршках і кантэйнерах, можна купляць на працягу ўсяго сезона — з вясны да восені. Але варта ведаць, што яны амаль напалову даражэйшыя, чым грунтовыя. Расліны з адкрытымі каранямі лепш купляць увосень. Вясной, як правіла, выбар такіх раслін меншы. Акрамя таго, яны могуць быць аслаблены ці пашкоджаны ў выніку няправільнага захоўвання зімой. Небяспека таго, што толькі што высаджаныя расліны з голымі каранямі вясной засохнуць, адпаведна большая, чым небяспека падмярзання раслін, якія па правілах пасаджаны ўвосень. Памер ямкі для расліны, якую высаджваеце, павінен быць прыблізна ў два разы большы за дыяметр кроны або велічыні прыкаранёвага камяка. Карані засыпаюць зямлёй з урадлівага верхняга слою або спецыяльна падрыхтаванай. Самы верхні слой робяць з малаўрадлівага ніжняга слою ямкі: гэта засцерагае ад паяўлення пустазелля.

Пры выбары садовых раслін трэба памятаць, што ў кожнай расліны ёсць свае асаблівасці, якія ў далейшым гарантуюць іх жыццяздольнасць.

## Сваё насенне караняплодаў

Папулярныя расліны ў кожным агародзе, так званыя самыя «хадавыя» караняплоды: пятрушка, сельдэрэй, морква. Гэта двухгадовыя культуры, таму насенне можна атрымаць на другі год. Караняплод звычайна захоўваюць у падвале ці склепе ўсю зіму, а вясной высаджваюць у грунт як матачнік. Ён выкідвае кветкавую стрэлку і да канца лета паспявае насенне. У час цвіцення караняплоды лёгка пераапыляюцца, ад гэтага губляюцца зыходныя гатунковыя якасці. Каб атрымаць надзейнае насенне, садзіце адзін гатунак культуры і размяшчайце яго як мага далей ад суродзічаў. У час цвіцення закрывайце марляй, а апыляць трэба ўручную парасонікамі таго ж гатунку.

Асабліва гэта датычыцца каранёвай **пятрушкі**. Прызначаныя на насеннікі карані можна пакінуць зімаваць у грунце, тады лісты з гэтых экзэмпляраў для кулінарных патрэбаў не трэба зразаць. Перад зімоўкай іх пажадана падкарміць суперфасфатам ці попелам. Прысыпаць перагноем, торфам, прыкрыць лапкамі, каб не вымерзлі. Вясной зноў падкарміць комплексным угнаеннем, а перад пачаткам цвіцення — попелам. Цвіце пятрушка доўга, насенне выспявае нераўнамерна, таму парасонікі зразаюць, як толькі пачынаюць жаўцець, і дасушваюць. Усходжасць насення пятрушкі захоўваецца 2-3 гады.

**Сельдэрэй** з іншымі культурамі не скрыжоўваецца, але каранёвы і ліставы лёгка пераапыляецца паміж сабой. Насенне сельдэрэю вельмі дробнае, у халаднаватае лета можа і наогул не паспець, так што атрымаць яго няпроста. Сеяць патрэбна толькі свежым насеннем, яно хутка страчвае ўсходжасць.

Гатункі **морквы** могуць скрыжоўвацца адзін з адным, а таксама з дзікай морквай. Таму абавязкова насеннікі морквы ў час цвіцення абвязваюць марляй. Раніцай марлю здымаюць, устрэсваюць цвітучыя парасонікі, або апыляюць уручную кветкамі таго ж гатунку, затым зноў надзяваюць марлевую павязку. Калі парасонік пабурэе, яго можна зразаць. Лепшае насенне даюць цэнтральныя парасонікі, бакавыя лепш выкідваць. Спелыя парасоны прасушваюць на посцілцы, затым іх абавязкова пераціраюць рукамі. Насенне прамываюць вадой, адбіраючы самыя цяжкія, якія аселі на дно, высушваюць. Усходжасць насення морквы захоўваецца 3-4 гады.

## Як сабраць насенне памідораў

*«Як правільна выбраць насенне памідораў са свайго ўчастка, каб высадзіць на наступны год гатунак, у якім упэўнены дакладна?»*
**Т. ЖЫБУЦЬ,** *в. Слабада Мінскага раёна.*



Па-першае, выберыце спелы памідор (вельмі добра, калі ён выспеў на расліне), няхай ён паляжыць крыху, да таго часу, пакуль не стане мяккім. Памыты і выцерты насуха памідор разрэжце ўпоперак — у такім разе лепш відаць насенныя камеры. Насенне разам з сокам і мякаццю выцісніце ў якую-небудзь пасудзіну (добра, калі яна будзе празрыстая, вам зручней будзе назіраць за тым, што адбываецца ўнутры), няхай гэтая маса пастаіць дзён 5-6 пры пакаёвай тэмпературы. На паверхні можа ўтварыцца цвіль — не варта гэтага палохацца. Наадварот, уся гэтая маса павінна пачаць брадзіць. За 5-6 дзён добрае, паўнацэннае насенне асядзе на дно пасудзіны, вось тады яго некалькі разоў прамыць вадой, тонкім слоем раскласці на тканіну ці паперу і падсушыць на сонцы. Захоўваць у папяровых пакецiках пры пакаёвай тэмпературы, але каб не дасталі грызуны.

## Карысна ведаць

- Калі ў вас няма мужчынскай расліны абляпіхі, заакуліруйце вочка на моцную галіну ў сярэдняй частцы кроны жаночага дрэва. Вясной галінку вышэй прышчэпкі абрэжце і праз годдва апыленне будзе забяспечана.
- Мульча, шчыльна падсыпаная да ствалоў дрэў, прыцягвае грызуноў і насякомых, якія з задавальненнем паядаюць кару. Таму мульчу лепш размясціць не горкай, а «абаранкам».
- Пакладзіце ў кошык з недаспелымі таматамі некалькі спелых ярка-чырвоных пладоў. Яны выдзяляюць газ, які паскорыць выспяванне астатніх.
- Каб таматы даўжэй заставаліся свежымі, пакладзіце іх у скрынкі пладаножкамі ўверх, перасыпце сухім торфам або стружкай і пастаўце ў цёмнае халаднаватае месца.
- Цыбульная муха не любіць торфу, таму адзін са спосабаў барацьбы з ёй — мульчыраванне глебы торфам адразу пасля пасадкі ці пачатку лёту мухі.

## ВЫРАШЧАНЫ — НЕ ГОРШЫ ЗА КУПЛЕНЫ



Клімаўчанка Насця Чурыліна вучыцца ў 5-м класе (4 скончыла на «выдатна»), займаецца ў дзіцячай школе мастацтваў, дзе іграе на фартэпіяна, любіць пасядзець за захапляльнай кнігай. Яшчэ ў яе ёсць маленькі брацік Алёша, з якім трэба пагуляць.

Але ўсё роўна яна знаходзіць час, каб прыйсці да бабулі Ніны і дзядулі Стаса, расказаць ім пра свае поспехі, школьныя справы і сяброў, калі трэба — дапамагчы ў чымсьці. А таксама паглядзець, што вырасла ў агародзе. Хапае ж тут на 6 сотках усяго, і самым галоўным, мабыць, для гаспадыні і яе ўнучкі з'яўляюцца кветкі, таматы, ягады.

Дарэчы, пра ягады. Акрамя нашых, традыцыйных, Ніна Васільеўна Пузырэўская вось ужо каторы год у адкрытым грунце вырошчвае і паўднёвыя — дыні, кавуны. Даводзіцца чаргаваць, таму што спрыяльнае месца толькі адно. Сёлета — год кавуноў. Было высаджана насенне гатункаў «Агеньчык» і «Малы». Вырасла на маленькім пятачку зямлі паўтара дзясятка штук. Некаторыя ўжо трапілі на стол. Пайшлі з ахвотай!

**Валянціна КВАРЦЮК.**

# БАРОНЫ




**Бароны — земляробчая прылада, прызначаная для разбівання камоў зямлі, для выраўноўвання зямлі пасля арання і для таго, каб зарыць у зямлю насенне пры пасеве. У народнай культуры славян бароны былі надзелены шэрагам якасцяў і былі ўдзельнікамі шматлікіх рытуальных дзеянняў.**

- Перш за ўсё, бароны сімвалізавалі пладавітасць, тым самым вызначаўся іх непасрэдны ўдзел у абрадах веснавога цыкла: у абрадзе сустрэчы, ці «гукання», вясны дзяўчыну-вяснянку вазілі на баронах па полі, прызначаным для пасеву яравых культур; у песнях-заклічках дзеці просяць «звезці зіму на санях і прывезці вясну на баронах»; у дні святкавання Дабравешчання, на Саракі і на Крыжпаклонным тыдні пяклі хлебцы ў выглядзе баронаў, якія перад пасевам з'ядалі тыя, хто будзе працаваць на полі, а таксама частавалі свойскую жывёлу.
- Наяўнасць зубоў у баронах паставіла іх у адзін рад з іншымі вострымі рэчамі, якія служылі абярэгам ад нячыстай сілы.
- На Русальным тыдні менавіта бароны станавіліся самым важным абярэгам ад гарэз-русалак. На працягу ўсяго тыдня забаранялася працаваць з зямлёй, бароны клалі пасярэдзіне двара дагары зубамі. Лічылася, той, хто парушыць забарону — «зловіць» баронамі русалку, а тая з помсты зацягне яго ў глухі лес ці патопіць у рацэ.
- Вядомыя прыклады таго, што бароны выконвалі свайго роду ахоўныя функцыі: бароны зубамі наверх ставілі каля ўваходу ў хлеў — «перакрывалі дарогу нячыстай сіле», бароны вешалі на вароты, падвешвалі ў хляве да столі, «каб ведзьмы не задойвалі карову» і г.д.
- Разам з тым лічылася, што праз бароны, як праз вокны, можна ўбачыць той свет: душы памерлых продкаў, ведзьмакоў і калдуноў, дамавіка ці лесуна, неабходна толькі прысесці ў хляве за бароны. Прычым чалавек станавіўся нябачным, як у шапцы-невідзімцы.
- Бароны як сімвал мужчынскага пачатку супрацьпастаўлялі зямлі (жаночаму пачатку). Таму іх часам выкарыстоўвалі і ў вясельным абрадзе.
- Калі нявеста была «нячэснай», бароны закідвалі на дах хаты бацькоў ці па вёсцы на баронах вазілі яе маці. У Віцебскай вобласці па гэтай жа прычыне свякроўка пры народзе прымушала нявестку пераступіць праз бароны.
- Лічылася, калі хтосьці з аднавяскоўцаў забудзецца на полі бароны, на працягу года вёску абыдуць усе сваты, і не адна дзяўчына не возьме шлюб. Каб «перакрыць» такія дзеянні, незамужнія дзяўчаты цягалі па вёсцы старыя бароны, ламалі іх і кідалі па ўскрайках дарогі.
- Часам дзяўчаты выкарыстоўвалі бароны ў магічных рытуальных дзеяннях, каб паўплываць на свой шлюб. Напрыклад, у Пятроў дзень бароны насілі на галаве з адной вёскі ў другую. Лічылася, дзе бароны застануцца, там і замуж выйдзеш.
- Каб прыехалі доўгачаканыя сваты, у ноч пад Раство дзяўчаты ламалі і секлі старыя бароны і раскідвалі па полі, імітуючы тым самы вясновы сеў.
- На Масленку старыя бароны спальвалі на скрыжаванні шляхоў і прасілі даслаць сватоў.
- У той жа час зуб ад баронаў мог стаць і сямейнай трагедыяй, калі хтосьці з нядобразычліўцаў у пэўны дзень года забіваў яго ў кут хаты. Тады дзяўчына назаўсёды застанецца жыць з бацькамі і нарадзіць дзіця.
- Бароны, якія прыйшлі ў заняпад, нельга было выкідаць: гэта лічылася грахом. Іх не выкарыстоўвалі ў рытуальных дзеяннях, часам замацоўвалі на слупах ці старых дрэвах, каб буслы маглі скарыстаць іх для будаўніцтва сваіх гнёздаў. Такое гняздо прадказвала гаспадарцы асаблівую ахову і дабрабыт.
- «Зубам» ад баронаў народныя лекары лячылі колючы боль, замаўлялі зубны боль у чалавека.
- На бароны «зубамі» ўверх бабка-павітуха слала кажух і клала нованароджанае дзіця, каб у яго не было, прышчоў, вяснушак і г.д.
- Цягнуць бароны па вёсцы, яе вуліцах, дарозе і г.д. без нагоды лічылася вялікім грахом. Пакараннем за «недакладнае выкарыстанне» прылады працы, якая сімвалізавала пладаноснасць зямлі, былі мор свойскай жывёлы, эпідэміі, пажары і іншыя беды.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

Утерянные бланки страховых полисов ЗАО «Мегарусс-Д» серии ААЛ №№ 106620290, 106620291 — г. Витебск; 106614115 — г. Гродно; 106613535, 106613551, 106613552, 106620950, 106620951, 106620952 — г. Минск; 106615962 — г. Пинск; 106614441 — г. Молодечно **считать недействительными.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 5115. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12